УДК 94(476)"1941"

*С.Я. НОВІКАЎ*

# БАІ ЗА МАГІЛЁЎСКІ ПЛАЦДАРМ З 20 ПА 26 ЛІПЕНЯ 1941 г.: ПОГЛЯД У СВЯТЛЕ НЯМЕЦКІХ КРЫНІЦ

*Упершыню ў айчынную гістарыяграфію ўводзіцца арыгінальная нямецкая крыніца, якая дазваляе рэканструяваць гісторыю абароны на адным з аператыўна важных участкаў магілёўскага плацдарма на працягу пятага тыдня вайны (з 20 па 26 ліпеня 1941 г.). Актуалізуецца праблема выкарыстання максімальна поўнага кола крыніц у айчыннай гістарыяграфіі. Акцэнтуецца ўвага на неабходнасці працягу працы беларускімі даследчыкамі па стварэнні навукова-абгрунтаванай канцэпцыі абароны Магілёва. На аснове новай дакументальнай крыніцы паказаны асноўныя этапы разгортвання баявых дзеянняў на паўднёва-заходнім участку абароны дняпроўскага рубяжа. Прыведзены дакладныя вынікі выканання баявой аперацыі адным з непасрэдных яе выканаўцаў у ходзе штурму магілёўскага плацдарма. Паводле ацэнкі ваеннага камандавання 23 пяхотнай дывізіі германскага вермахта, на сваім участку наступлення нямецкія часткі сустрэлі баявы рубеж супраціўлення.*

Баявыя дзеянні летам 1941 г. на дняпроўскім рубяжы па цяперашні час не страчваюць сваёй актуальнасці ў айчынных даследчыкаў. Абаронай Магілёва ўпісаны гераічныя радкі ў гісторыю Вялікай Айчыннай вайны. 23-дзённае баявое супраціўленне на магілёўскім плацдарме – адна з самых яркіх старонак гісторыі першых месяцаў вайны на беларускай зямлі. Сёння кожны школьнік і студэнт, кожны грамадзянін маладой беларускай дзяржавы ведае факты аб стойкасці і мужнасці, масавым гераізме і велічы подзвігу абаронцаў 1941 г. на Дняпры ў раёне Магілёва.

Аб важнасці гэтай гістарычнай падзеі ў айчыннай гістарыяграфіі сведчыць з'яўленне ў ёй асобнага даследчыцкага напрамку [1; 2]. Бібліяграфія "23-дзённай абароны Магілёва 1941" утрымлівае публікацыі рознага жанру, сярод якіх асаблівую каштоўнасць уяўляюць навуковыя даследаванні [2; 3; 4; 5; 6; 7; 8; 9; 10]. З іх вынікае, што шэсць пасляваенных дзесяцігоддзяў не хапіла для таго, каб на прафесійным узроўні былі ліквідаваны ўсе "белыя плямы", створаны абагульняючыя навуковыя працы і напісана аб'ектыўная гісторыя абароны Магілёва летам 1941 г.

Аналіз навуковых вынікаў вывучэння баявых падзей на дняпроўскім рубяжы пад Магілёвам летам 1941 г. не зусім задавальняе цяперашніх даследчыкаў ваеннай гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Так, на думку магілёўскага гісторыка Г.І. Валчка, асобныя праблемы абароны Магілёва летам 1941 г. да гэтага часу чакаюць свайго навуковага абгрунтавання [1, с. 10]. У канцэптуальным плане аб падзеях пад Магілёвам выказваецца М.С. Барысенка, які падкрэслівае ў сваёй грунтоўнай працы "Днепровский рубеж : трагическое лето 1941-го", выдадзенай да 60-годдзя Перамогі, што даследчыкі дзесяцігоддзямі распрацоўвалі навуковую канцэпцыю абароны Магілёва, аднак толькі цяпер прыступілі да стварэння яе навукова-абгрунтаванай асновы [3, с. 6]. Хаця яшчэ ў 1950-я гг. у ліку першых задачу па "аднаўленні перыпетый бязлітасных баёў у раёне Магілёва" ставіў Маршал Савецкага Саюза А.І. Яроменка, камандуючы Заходнім фронтам летам 1941 г. [11, с. 108].

Мэтай нашага артыкула з'яўляецца ўвядзенне ў навуковы ўжытак матэрыялаў арыгінальнага нямецкага дакумента – *Данясення пра бой за Магілёў* [12].

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Па-першае, да цяперашняга часу матэрыял гэтага дакумента быў невядомы ў айчыннай гістарыяграфіі, асабліва тым прафесійным гісторыкам, хто даследаваў гісторыю "23-дзённай абароны Магілёва летам 1941 года" [1–11; 13–16]; па-другое, упершыню беларускаму чытачу прадстаўлена практычная магчымасць для самастойнага знаёмства з поўным тэкстам дакумента, які ўтрымлівае супрацьлеглы погляд на баявыя дзеянні пад Магілёвам з 20 па 26 ліпеня 1941 г.; па-трэцяе, падзённая дэталізацыя баявых падзей, паказаных у данясенні камандзіра 23-й нямецкай пяхотнай дывізіі, даюць дадатковыя падставы для новай рэканструкцыі падзей, замацаваных радкамі нямецкага дакумента; па-чацвёртае, вывучэнне дакументальных матэрыялаў можа стаць для прафесійных гісторыкаў тым падмуркам, на аснове якога больш адметна акрэсліваюцца ўсе контуры абароны плацдарма вакол Магілёва; і, па-пятае, у айчынных гісторыкаў могуць з'явіцца дадатковыя падставы для таго, каб параўнаць ход баявых дзеянняў, прааналізаваць іх і ўбачыць, у якой ступені яны суадносяцца ў айчынных і замежных дакументальных і гістарыяграфічных крыніцах. У гэтым аспекце прапанаваны матэрыял носіць адметны характар.

Але галоўнай адметнасцю нашага артыкула з'яўляецца тое, што ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі ставіцца праблема аб неабходнасці неадкладнай распрацоўкі адной з самых змрочных старонак Магілёўскай абароны – лёсу дзесяткаў тысяч ваеннапалонных. Мінула больш за шэсць дзесяцігоддзяў пасля заканчэння вайны, аднак беларуская гістарыяграфія захоўвае гэту вялікую "белую пляму" ў дачыненні да лета 1941 г. на магілёўскай зямлі [3, с. 122].

Зазначым, што ў данясенні прыводзіцца лічба аб савецкіх ваеннапалонных, якія патрапілі ў нямецкі палон на працягу выканання загаду аб заняцці Магілёва: "колькасць захопленых палонных перад [выдзелена ў дакуменце. – С.Н.] канчатковым заняццем горада складала 10 афіцэраў і 3043 радавыя" [12, Bl. 10]. Асобным радком у данясенні камандзіра 23-й дывізіі згадваецца агульная лічба палонных, хто патрапіў у рукі немцаў у ходзе наступлення трох палкоў дывізіі толькі на паўднёва-ўсходнім рубяжы магілёўскага плацдарма. Паводле архіўнага дакумента, тут было захоплена 9 тыс. палонных [12, Bl. 9]. Між тым у працах беларускіх гісторыкаў гэтыя факты пакуль не сталі прадметам спецыяльнага даследавання [3, с. 122], дзякуючы якому можна было б хоць часткова зменшыць "белую пляму" ў гісторыі абароны Магілёва летам 1941 г. Абыходзячы гэтую тэму маўчаннем, мы не садзейнічаем яе канчатковаму вырашэнню. Асабліва відавочным гэта з'яўляецца ў кантэксце таго факта, што ў Магілёве ў час вайны знаходзілася 8 лагераў для ваеннапалонных [17, с. 43]. Паводле вядомых звестак, толькі ў адным "шталагу № 313 Лупалава" знаходзілася звыш 40 тысяч палонных [18, с. 55].

Сёння мала хто з беларускіх ваенных гісторыкаў спрачаецца адносна таго, што для большасці воінаў Чырвонай Арміі летнія месяцы 1941-га сталі "трагічным летам". Сотні тысяч савецкіх салдат і афіцэраў патрапілі ў нямецкі палон, прычым даволі значная частка з іх апынулася ў палоне якраз у першыя тыдні вайны на тэрыторыі Беларусі. Не быў выключэннем у гэтым плане і Магілёў [5, с. 275]. Па падліках, паводле выключна нямецкіх дакументаў, аснову якіх складаюць дзённікі баявых дзеянняў 7-й, 15-й, 23-й і 78-й пяхотных дывізій, данясенні і рапарты камандавання VII пяхотнага корпуса, а таксама аператыўныя матэрыялы галоўнага камандавання 2-й арміі германскага вермахта, агульная лічба савецкіх ваеннапалонных, якія на працягу тыдня (з 20 па 26 ліпеня 1941 г.) патрапілі ў нямецкі палон, складала **35 031 палонны, у тым ліку 31 афіцэр Чырвонай Арміі** [19, Bl. 97 R; 20, Bl. 52; 21, Bl. 78 R; 22, Bl. 398; 23, Bl. 214; 24, Bl. 96 R; 25, Bl. 293].

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Зразумела, гэта лічба патрабуе навуковай верыфікацыі, што магчыма пры правядзенні толькі асобнага спецыяльнага даследавання. У той жа час яе ўвядзенне ў навуковы зварот стварае дадатковыя падставы для больш перакананага вытлумачэння паходжання агульнай лічбы воінаў Чырвонай Арміі, хто браў непасрэдны ўдзел у абароне ўсяго дняпроўскага рубяжа, у тым ліку горада Магілёва летам 1941 г.

Навуковы аналіз дакумента садзейнічае атрыманню новых, хаця і супярэчлівых, звестак аб рэальных баявых падзеях, да гэтага часу ўсебакова не адлюстраваных нават у спецыяльных даследаваннях [1–10]. Паводле гісторыка-дакументальнай хронікі Магілёва [14], гарадоў і раёнаў Магілёўскай вобласці [15] і новых прац аб абарончых баях на Дняпры [3; 7; 8; 16; 26], "23-дзённая абарона Магілёва летам 1941 г. дагэтуль застаецца ў рамках канцэпцыі, створанай савецкай гістарыяграфіяй.

У нашым выпадку дакумент у дапаўненне да традыцыйнага апісання баявых дзеянняў на дняпроўскім рубяжы пад Магілёвам дае магчымасць убачыць другі бок суцэльнага малюнка абароны магілёўскага плацдарма. Вельмі важна, "зыходзячы з канкрэтнай абстаноўкі таго часу, з рэальна існуючай сітуацыі" [3, с. 3], даведацца аб фактычных сілах баявога супрацьстаяння, удакладніць сапраўдныя маштабы баявых дзеянняў і, самае істотнае, у колькасным аспекце убачыць страты, панесеныя савецкім бокам на паўднёва-заходнім участку абароны Магілёва. Дакумент дапамагае чытачу ўбачыць падзеі з процілеглага боку, без якога не было б рэальных баявых дзеянняў пад Магілёвам, у тым ліку гераічнай абароны гэтага плацдарма сіламі 148-га, 388-га, 394-га, 507-га, 514-га, 543-га, 747-га стралковых палкоў і магілёўскімі народнымі апалчэнцамі [3, с. 231].

Можна не прымаць некаторых высноў і ацэнак, змешчаных у дзённіку баявых дзеянняў ці ў перакладзеным дакуменце, аднак нельга адмаўляць факты, якія патрабуюць узважанага аналізу, крытычнага падыходу і грунтоўнай апрацоўкі спецыялістамі. Аўтар у дадзеным артыкуле не ставіць перад сабой такой задачы, а толькі ўводзіць у шырокі ўжытак архіўны дакумент. Паглядзець на падзеі з іншага боку, вачыма праціўніка, крайне карысна для высвятлення ісціны ў навуцы, для аб'ектыўнага аналізу падзей ваеннай гісторыі Беларусі. А гэта ставіць чытача перад няпростым выбарам: або адысці ад аднабаковага погляду і, такім чынам, пазбегнуць суб'ектыўных ацэнак, або пайсці шляхам усебаковага аналізу падзей на аснове існуючых гістарычных і гістарыяграфічных крыніц. Зазначым, што нямецкі дакумент не замоўчвае тое, што чырвонай ніткай праходзіць праз данясенне камандзіра 23-й берлінска-брандэнбургскай дывізіі вермахта аб баявых падзеях пад Магілёвам на працягу тыдня з 20 па 26 ліпеня 1941 г.: на сваім шляху дывізія сустрэла моцны рубеж супраціўлення, на якім вялася абарона горада, дзе на кожным участку мелі месца рашучыя баі, выкарыстоўвалася самая розная тактыка і, пры гэтым, абаронцы не думалі ні аб ніякай здачы магілёўскага плацдарма [12, Bl. 5]. Так выконваўся загад савецкага вышэйшага камандавання аб пераўтварэнні Магілёва ў "непрыступную крэпасць" [15, с. 190].

Тэкст падрыхтаваны да друку на аснове дакумента, выяўленага аўтарам у фондзе Федэральнага ваеннага архіва Германіі ў Фрайбургу (зямля Бадэн-Вюртэмберг. – С.Н.). Дакумент уводзіцца ўпершыню. Пераклад архіўнага матэрыялу зроблены без купюр. У дачыненні толькі да асобных палажэнняў і спецыфічнай лексікі рапарта аўтар палічыў патрэбным унесці пэўныя ўдакладненні, узятыя ў англійскія дужкі, якія не скажаюць сэнс, а робяць для чытача тэкст больш даступным. У тэксце пакінуты рымскія і арабскія лічбавыя абазначэнні, праз якія ў дакуменце зафіксаваны нумары германскіх вайсковых падраздзяленняў.

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

*Федэральны ваенны архіў Германіі, далей ВА-МА. RH 26-23/95: Abt. I a : Gefechtsbericht über die Schlacht um Mogilew. Bl. 1–10. Арыгінал (пераклад аўтара). Друкуецца ўпершыню.*

23-я пяхотная дывізія[1] Палявы штаб, 29 ліпеня 1941 г.
Аддзел I a

Данясенне пра бой за Магілёў

16-17 ліпеня 23-я дывізія зварочвае з ранейшага маршруту на паўднёвы ўсход і пачынае наступленне на Магілёў. Становішча непрыяцеля: праціўнік сіламі адной дывізіі абараняе плацдарм пад Магілёвам на Дняпры. Прыкладна лінія абароны праходзіць па рубяжы [вёсак] Сялец – Цішоўка – Пашкава – Паўлаўка.

Дывізія, якая была на маршы з 29 чэрвеня без значных прывалаў і пры асаблівай спякоце, дасягае рубеж на ўчастку Вабіч. А 8-й гадзіне раніцы 19 ліпеня апошнія падраздзяленні дывізіі, якія уначы з 19 на 20 займаюць зыходную пазіцыю пасля невялікага прывалу, гатовы для наступлення па лініі [рака] Лахвы – паміж чыгуначным пунктам (5 км на захад ад Туманаўкі) і Карэлаўкай.

Ахову зыходнай пазіцыі на лініі Лахвы бярэ на сябе разведвальны атрад фон Нойвіля з 2-й арміі, які знаходзіцца тут ужо некалькі дзён.

18 ліпеня [камандаваннем] VII армейскага корпуса вызначаны тэрмін наступлення на магілёўскі плацдарм – а 14-й гадзіне 20 ліпеня. Паведамленні пра [становішча] ворага не дазваляюць зрабіць дакладную ацэнку аб сіле праціўніка. Разведвальны атрад 2-й арміі ў выніку сваёй дзейнасці заключае, што пры размове аб праціўніку трэба зыходзіць аб групоўцы ў складзе каля дзвюх дывізій, якая ў выпадку імклівага наступлення абавязкова б адступіла. [Камандаванню] не вядомы звесткі аб цяжкіх баях 3-й танкавай дывізіі пад Магілёвам.

Магчымасць для правядзення ўласнай разведкі перад наступленнем адсутнічае з-за недахопу часу.

Размежавальныя лініі справа ад XII армейскага корпуса і злева ад 7-й дывізіі (гл. карту–дадатак)[2].

Загад для наступлення 23-й дывізіі гучыць наступным чынам:

Заняць плацдарм па агульнай лініі [вёсак] Грэбенева – Палетнікі – Вялікая Бароўка і захапіць шляхам штурму мост у Магілёве.

23-я дывізія вырашае весці наступленне на правым флангу на лініі: узвышша (5 км на захад ад Туманаўкі) – Сялец – Грэбенева; мяжа злева: Карэлаўка – Шаперня – паўднёвая ўскраіна Магілёва.

Для гэтага патрэбна:

[1] Па штатным раскладзе дывізія павінна была мець 518 афіцэраў, 102 чыноўнікі, 2573 унтэр-афіцэры і 13667 радавых. Агульную колькасць дывізіі складалі 16 860 чалавек. Пяхотная дывізія ваеннага часу мела ў штаце штаб дывізіі, 3 пяхотныя палкі, роту палявой артылерыі, батальён знішчальнікаў танкаў, калону лёгкай пяхоты, разведвальны батальён, аддзяленне веласіпедыстаў, цяжкі (матарызаваны) артдывізіён, артылерыйскі полк, артылерыйскую калону, сапёрны батальён, калону мостаўкладальнікаў, лёгкую санітарную калону (матарызаваную), батальён сувязі, тылавыя службы, медыцынскую і ветэрынарную службы, ваенную паліцыю і паштовую службу / Состав и структура пехотной дивизии вермахта по состоянию на 15 мая 1941 г. // *Борисенко, Н.С.* Днепровский рубеж: трагическое лето 1941-го / Н.С. Борисенко. – Могилев: УПКП "Могилевская областная укрупненная типография имени Спиридона Соболя", 2005. – С. 346.

[2] Гл. фрагмент нямецкай карты, выяўлены сярод матэрыялаў дзённіка № 3 баявых дзеянняў 23-й пяхотнай дывізіі з 25.05 да 7.08.1941 г.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова




Фрагмент нямецкай карты. BA-MA RH 26-23/72: Anlagen zum KTB Nr. 3 v. 25.5-7.8.41, Bl. 69-69 R

1. Выкарыстаць магчымасць пераправы ўброд і захапіць мост на поўдзень ад [в.] Буйнічы (па выказваннях мясцовых жыхароў і палонных).

2. Пакінуць за сабой раён Цішоўкі – вышыні 196 (на захад ад Магілёва).

3. Выкарыстаць магчымасць імклівага прарыву на гарадскі [дняпроўскі] мост з захаду па дарозе Карэлаўка – Магілёў і з паўднёвага захаду паміж Дняпром і дарогай Сялец, Буйнічы, Магілёў.

Дывізія рашуча пераходзіць у наступленне без артылерыйскай падрыхтоўкі з лініі Лахвы: справа 9-ы полк[3], злева 68-ы полк (гл. дадатак)[4], абодва палкі засяроджваюць сілы на ўнутраным флангу. Напрамак галоўнага ўдару для 67-га палка – правы фланг у лесе на захад ад Карэлаўкі. Разведка пры ўдзеле перадавога атрада 23 [дывізіі] з пачатку наступлення займае ўсходні бераг па лініі Красніца – Сялец па абодва бакі Салтанаўкі і ахоўвае паўднёвую частку Грэбенева з поўдня і паўднёвыя пункты.

Наступленне 9-га пяхотнага палка праходзіць паспяхова без аказання ворагам істотнага супраціўлення. У той жа час 68-ы пяхотны полк на лініі Высокае – заходняя Цішоўка сустракае на сваім шляху ўсё больш моцны супраціў ворага. З 14.15 пачынаецца ўзмоцнены артылерыйскі агонь па ўсёй плошчы паміж Галынцом – Цішоўкай – Карэлаўкай – Клінам. Нягледзячы на шматлікія гераічныя і адважныя спробы па прарыве варожай абароны байцамі 68-га пяхотнага палка, у гэты дзень удаецца толькі нязначна прасунуцца за лінію наступлення.

9-му пяхотнаму палку ўдаецца перайсці Днепр каля [в.] Буйнічы, услед за гэтым стварыць невялікі плацдарм і прасунуць ахову на поўнач і на ўсход, правесці дальнюю разведку ў напрамку Лупалава. Адзін батальён застаецца ў раёне Сяльца.

21 *ліпеня* працягваецца наступальная аперацыя, мэта якой застаецца нязменнай. [Камандаванне] дывізіі спадзяецца на тое, што пры паўторным масіраваным удары штурмавой групе ўдасца прарваць варожыя ўмацаванні паміж Сяльцом і Цішоўкай і захапіць гарадскі мост у Магілёве. Камандаванне разумее, што з улікам шырыні фронту і ўпартай абароны праціўніка толькі аб'яднанне сіл дывізіі можа прывесці да поспеху.

На гэтай аснове камандаванне дывізіі адмаўляецца ад дадатковых рэзерваў для працягу наступлення 21 ліпеня. Яно уводзіць два батальёны 67-га пяхотнага палка на правым флангу 68-га пяхотнага палка паміж Дняпром і чыгункай у якасці штурмавой групы з задачай – захапіць з Буйнічаў паўднёва-заходнюю ўскраіну Магілёва, пры гэтым заняць вышыню і ліквідаваць ворага, які знаходзіцца ў паўднёвай частцы Магілёва. Штурмавая група павінна паспрабаваць па магчымасці рашучай атакай узяць мост. Галоўнай задачай застаецца захоп гарадскога моста ў Магілёве, па магчымасці цэлым, паколькі гэта важна для агульнага становішча.

У 9.15 пачынаюць наступленне 67-ы і 68-ы пяхотныя палкі. Для далейшых дзеянняў крайне важнай можа з'явіцца перагрупоўка артылерыі з асобнымі штурмавымі групамі. Нягледзячы на размах наступальнай аперацыі, 67-ы пяхотны полк амаль адразу сустракае ўпартае супраціўленне пад Буйнічамі. На працягу

[3] Штатны расклад пяхотнага полка ўключаў 75 афіцэраў, 7 чыноўнікаў, 493 унтэр-афіцэры і 2474 радавых. У пяхотны батальён уваходзяць: камандзір, чыноўнік, 846 унтэр-афіцэраў і радавых / Состав и структура пехотной дивизии вермахта по состоянию на 15 мая 1941 г. // *Борисенко, Н.С.* Днепровский рубеж: трагическое лето 1941-го / Н.С. Борисенко. – Могилев: УПКП "Могилевская областная укрупненная типография имени Спиридона Соболя", 2005. – С. 347.

[4] Дадаткам з'яўляецца намаляваны ад рукі разгорнуты план мясцовасці, выкананы ў маштабе 1:50000, на якім нанесены пярэднія рубяжы абароны з указаннем пазіцый, занятых 1-м, 2-м і 3-м батальёнамі, і месцазнаходжанне штаба 388-га стралковага палка. Надпісы зроблены на рускай мове натуральна.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

дня палкі спрабуюць захапіць новыя пазіцыі шляхам бязлітасных дзеянняў, аднак без абавязковай артылерыйскай падрыхтоўкі гэта магчыма толькі пры вялікіх стратах.

Становіцца відавочным той факт, што размова ідзе пра плацдарм пад Магілёвам, прафесійна ўмацаваны рускімі, прычым з трывалым разуменнем справы па выкарыстанні фланкіравання палявых умацаванняў, падрыхтаваных у адпаведнасці з планам. Умацаванні прыкрываюцца моцным артылерыйскім агнём і рашуча ўтрымліваюцца. Нягледзячы на гэта, 7-я дывізія на паўночным участку наступлення робіць чарговую спробу зламаць як мага хутчэй супраціўленне праціўніка, дзе яго становішча тактычна больш цяжкае.

У наступныя дні кожная рота, кожны атрад і кожны салдат прымаюць удзел у гераічных баявых дзеяннях на пазіцыях праціўніка. Пяхота пачынае бой, які, як правіла, завяршаецца ў бліжнім баю.

У такіх умовах трэба даць высокую ацэнку штурму гарадскога моста ў Магілёве апоўдні 21 ліпеня лейтэнантам Брандтам, камандзірам 10-й роты 67-га пяхотнага палка. Разам з ротай яму ўдаецца дабрацца незаўважаным да стромкага заходняга берага Дняпра, паралізаваць агнём рух транспарту і перадыслакацыю рускіх, захапіць мост. Нягледзячы на тое, што рускія блакіруюць роту Брандта захопам стромкага берага, а варожы агонь з абсталяванага пад крэпасць выступу паўночнага берага ракі ў 200 м ад гарадскога моста прымушае адступіць лейтэнанта Брандта, ён працягвае ўтрымліваць гэту пазіцыю, утварыўшы заслон з артылерыйскага агню. Між тым раніцай 22 ліпеня на мосце на поўнач ад Лупалава з ім устанаўлівае сувязь 9-ы пяхотны полк, які падышоў на ўсходні бераг [Дняпра]. Трэба быць удзячным гераічнаму наступу лейтэнанта Брандта і яго людзям, што дывізія захапіла мост без пашкоджанняў і цалкам паралізавала рух рускіх.

Вечарам 21 ліпеня 9-ы пяхотны полк пачынае наступленне ў напрамку Лупалава, займае мясцовасць у выніку бязлітаснага начнога бою, захоплівае гарадскі мост у Магілёве, сустракаецца з 10-й ротай 67-га пяхотнага палка, утрымлівае мост і стварае невялікі плацдарм на тым беразе.

Да 8-й гадзіны раніцы на працягу ночы 21–22 ліпеня сапёрным падраздзяленнем дывізіі ўзводзіцца мост на поўдзень ад Буйнічаў.

22 ліпеня дывізія працягвае цяжкія наступальныя баі сіламі 67-га і 68-га пяхотных палкоў. Варожы артылерыйскі агонь, калі і прыпыняецца на некаторы тэрмін, аднаўляецца з новай сілай. Паўсюдна наступаючая пяхота натыкаецца на абарончыя пазіцыі, якія накрытыя чатырма ярусамі бэлек і злучаныя падземнымі ходамі. Драцяныя перашкоды і створанае фланкіраванне пазіцый моцна ўскладняюць планамернае вядзенне наступлення. Выдатная маскіроўка робіць непрыкметнымі цэлі, якія падлягаюць знішчэнню цяжкім пяхотным узбраеннем і артылерыяй і нават падцягнутымі і ўсталяванымі зенітнымі гарматамі. Абарончыя збудаванні трэба назваць узорнымі, бо ўся прылеглая тэрыторыя знаходзіцца пад агнём кулямётаў і гранатамётаў. Шматлікія і ўмела расстаўленыя мінныя палі дапаўняюць сістэму ўмацаванняў.

Асаблівыя цяжкасці мае 68-ы пяхотны полк, на шляху якога ў лясных участках знаходзяцца палявыя ўмацаванні праціўніка на паўночны ўсход ад [в.] Высокае, да якіх немагчыма падступіцца. Наступленне палка спыняецца.

9-ы пяхотны полк падчас баявых дзеянняў на паўднёвым беразе Дняпра ўтрымлівае невялікі плацдарм на гарадскім мосце Магілёва. На больш узвышаным беразе вораг умела ўсталяваў шматлікія кулямёты, супрацьтанкавыя гарматы і мінамёты. Любы рух у той жа момант трапляе пад агонь снайпераў і тым самым робіць немагчымым любое перамяшчэнне на працягу дня. Зараз камандаванне дывізіі занепакоена тым, як доўга можна будзе ўтрымліваць мост.

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова

У другой палове 22 ліпеня 78-я пяхотная дывізія пачынае наступленне на Магілёў з лініі Навасёлкі – Сідараўка – Падбелле на ўсходзе Дняпра. 9-ы пяхотны полк па загаду камандавання 23-й дывізіі накіроўвае свае галоўныя сілы ў раён Лупалава для аховы яго ўсходняга і паўднёва-ўсходняга рубяжоў. Пры вялікіх стратах з боку праціўніка, заціснутага з паўднёвага ўсходу сіламі 78-й дывізіі, рускія сілы спрабуюць прарвацца ў Магілёў.

Вечарам 22 ліпеня 23-я дывізія на правым флангу ўтрымлівае паўднёва-ўсходнюю і ўсходнюю ўскраіны Лупалава, невялікі плацдарм на гарадскім мосце Магілёва, а левым флангам моцна трымае раён на поўнач ад Буйніч і мясцовасць на паўднёвы ўсход ад Галынца.

Паколькі на працягу першых дзён нападу высветлілася, што Магілёў немагчыма ўзяць невялікімі сіламі, прагал паміж 23-й і 7-й дывізіямі трэба заняць 15-й дывізіі, якая з пачаткам 23 ліпеня пераадольвае рубеж [р.] Лахва. Пасля абеду яна павінна нанесці ўдар па вышыні 196 у напрамку паўночна-заходняй лініі абароны Магілёва.

Паміж тым, раніцай 23 ліпеня дывізія пры ўдзеле 67-га і 68-га палкоў працягвае наступленне з прымяненнем нядаўна прыбыўшага 192-га падраздзялення штурмавых артылерыйскіх гармат і з выкарыстаннем агнямётаў. 9-ы пяхотны полк павінен працягваць ахову моста і прадухіліць спробы нападу з боку праціўніка. З цяжкімі баямі дывізія пастунова займае тэрыторыю. Каля 15-й гадзіны 67-ы пяхотны полк дасягае Горак, адкуль разведвальны атрад 23-й дывізіі займае Ракузаўку. Пры далейшым вывучэнні становішча падаецца, што можа быць паспяховым удар па паўночным флангу 68-га пяхотнага палка. Здаецца магчымым абысці ўмацаванні перад ранейшым цэнтрам і на правым флангу палка адначасова атакаваць Магілёў з поўначы і ўсходу. [Камандаванне] дывізіі загадвае 68-му палку зрабіць перагрупоўку сіл. Пасля гэтага полк застаецца для аховы рубяжа, які заняў на лініі фронту пад Ракузаўкай да 19.30, узмацняецца сіламі другога батальёна 67-га пяхотнага палка і разведвальным падраздзяленнем. Яшчэ надвячоркам палку ўдаецца заняць усходнюю ўскраіну лесу на ўсход ад Ракузаўкі. 24 ліпеня да наступлення далучаецца 15-я дывізія, якая між тым заняла вышыню 196.

У другой палове таго ж дня прыходзіць данясенне з 9-га пяхотнага палка, што пасля сістэматычнага абстрэлу з дапамогай наступальнай пяхотнай зброі і з зенітных грамат калібрам 8,8 см абарончых умацаванняў рускіх, якія знаходзяцца насупраць моста, полк мае намер пачаць штурм у 16.15. У памкненні садзейнічаць гэтаму і ў рэшце праз паслабленне варожай абарончай сістэмы на паўднёвай частцы Магілёва пачынае наступленне першы батальён 9-га пяхотнага палка на чале са сваім камандзірам маёрам Ханігам. У той час як прадугледжаныя для гэтага падраздзяленні батальёна рыхтуюцца да атакі ў паўночнай частцы моста, маёр Ханіг асабіста ўзначальвае атаку праз мост, паказваючы ўзор для атакі. У гэты час батальён падвяргаецца смяротнаму кулямётнаму і вінтовачнаму абстрэлу з як быццам бы падаўленых абарончых умацаванняў на процілеглым беразе. Маёр Ханіг быў цяжка паранены ў самым пачатку атакі на мосце (паўночная частка), але заклікае сваіх людзей да працягу атакі. Яны з адвагай выконваюць заклік свайго любага і праверанага ў баях камандзіра, калі ён сам годна прымае смерць салдата ў выніку трапных кулявых пападанняў.

Аднак працяг бясстрашнай атакі першым батальёнам 9-га пяхотнага палка з'яўляецца марным. Імклівае развіццё атакі спыняецца смяротным агнём праціўніка і прыводзіць да значных страт. Параненых і забітых нельга ні вынесці з поля, ні замяніць кімсьці. Тым часам страчваюцца пазіцыі на ўмацаваным плацдарме. Аднак мост застаецца пад аховай 9-га пяхотнага палка.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Становішча вечарам 23 ліпеня выглядае наступным чынам:

67-му і 68-му пяхотным палкам, якія наступалі на цэнтр абароны, пакуль не ўдалося прарваць рубеж абароны Магілёва. Бачна, што пры дапамозе планамерных, хаця вельмі працяглых па часе і стратных па жывой сіле наступальных аперацый, дасягаецца знясіленне рускай абароны. Існуе апраўданая надзея, што на наступны дзень пад уздзеяннем удару 15-й дывізіі будзе паспяховым працяг наступлення на вонкавых флангах палкоў.

Умовы мясцовасці, вельмі стромкія берагі Дняпра на паўднёвай ускраіне каля 9-га пяхотнага палка не дазваляюць, аднак, адбіць згубленыя рубеж і аднавіць невялікі перадавы плацдарм. [Камандаванне] дывізіі лічыць, што з гэтага моманту на першым плане для палка стаіць задача аб прадухіленні прарыву рускіх на поўдзень. Гэтаму спрыяе наступленне 78-й дывізіі, што адцягвае сілы ворага, які беспаспяхова вядзе абарону на поўдні ад Дняпра. Але дывізія спадзяецца, што атрымаецца выратаваць таксама і мост.

У дачыненні да 24 ліпеня быў аддадзены загад аб працягу масіраваных удараў на ўмацаваны горад Магілёў. Задача для 23-й дывізіі гучыць наступным чынам:

23-я дывізія, якая ў паўднёвай частцы горада вяла трохдзённыя баі за ўмацаваныя пазіцыі па абодва бакі Дняпра, панесла значныя страты ў выніку працягу наступлення, павінна заняць паўднёвую частку горада, ачысціць яе і падрыхтавацца да далейшага наступлення на ўсход.

У той час калі 9-ы пяхотны полк ахоўвае мост, асобныя падраздзяленні сапёрнага і разведвальнага батальёнаў, танкавай і веласіпеднай рот пры падтрымцы пяхотнай артылерыі ў 7 гадзін раніцы 24 ліпеня зноў пачынаюць наступленне. 67-му пяхотнаму палку ўдаецца прасунуцца на тэрыторыю фабрыкі ў паўднёвай частцы горада, тады як 68-ы пяхотны полк на заходняй ускраіне горада дасягае чыгуначнай лініі, якая пралягае з поўначы на поўдзень. Аднак і тут прасоўванне наперад зноў ускладняецца, паколькі палкі трапляюць пад шквальны мінамётны і кулямётны агонь, які вёўся з тэрыторыі фабрыкі і ўскраіны горада ў сувязі з адсутнасцю папярэдняй артылерыйскай падрыхтоўкі і амаль не ліквідаваных [намі] пунктаў супраціўлення [праціўніка]. Падтрымка артылерыі для атакуючых груп звужаецца па прычыне пранікнення 15-й дывізіі ў паўночную частку горада. Надвячоркам 67-ы і 68-ы палкі шчыльна акружаюць паўднёвую частку горада, 15-я дывізія захоплівае тэрыторыю каля чыгункі на паўночнай ускраіне горада. У самім горадзе праціўнік застаецца яшчэ не ліквідаваным і гатовы да абароны да апошняй кропкі.

Можна чакаць баявых дзеянняў з кожнага дома.

Каб не дапусціць узаемнага абстрэлу ў складаных умовах узяцця горада, канчатковае ачышчэнне горада застаецца за 15-й дывізіяй, і толькі невялікія ахоўныя падраздзяленні дывізіі застаюцца на ранейшых пазіцыях на поўнач ад Дняпра. У ноч з 24 на 25 ліпеня дывізія вылучаецца для далейшага наступлення, тады як 9-ы пяхотны полк застаецца ахоўваць мост да канчатковага ўзяцця горада 15-й дывізіяй.

Раніцай 26 ліпеня ўздоўж Дняпра ляжыць непраглядны туман. Бачнасць складае толькі некалькі метраў. Гэта дае праціўніку магчымасць падабрацца незаўважаным з боку аховы 9-га пяхотнага палка да паўночнай часткі амаль 200-метровага моста. Полк не змог перашкодзіць рускім падарваць мост, выкарыстоўваючы для гэтага раней пакінутыя, але не выяўленыя выбуховыя прыстасаванні. Вораг пазбаўляе сябе такім чынам апошняй сувязі, якая яму больш не патрэбна з прычыны доўгачаканай ліквідацыі акружэння. Праведзеныя адчайныя спробы ворага прарваць ахову 23-й дывізіі ў напрамку [в.] Сялец не мо-

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

гуць больш выратаваць лёс акружанага праціўніка. Нападаючы, вораг ліквідуецца ці трапляе ў палон.

Пры гэтым ў 68-м пяхотным палку асабліва вылучаецца падраздзяленне Гізэвіуса, якое часткова ў блізкім баі здолела паспяхова стрымліваць спробы прарыву значна пераўзыходзячых сіл праціўніка. Толькі адно аддзяленне, падпарадкаванае ўзводу процітанкавай артылерыі, выпусціла 120 мін. Страты праціўніка былі істотнымі. Былі ўзяты 500 палонных.

Спроба, зробленая ўначы з мэтай разбурыць мост на поўдзень ад Буйніч з выкарыстаннем надзьмутых лодак, была прадухілена ахоўным агнём сапёрных падраздзяленняў (23 і 221).

Толькі 26 ліпеня ў 11.15 горад амаль цалкам ўзяты 15-й дывізіяй, якая ў гэты час можа злучыцца з 9-м пяхотным палком 23-й дывізіі на паўночным беразе Дняпра.

З гарадскога цэнтра ўзяты 9 тыс. палонных.

23-я дывізія вызначылася адвагай, бясстрашнасцю і гераізмам як сваіх салдатаў, так і духам наступлення падпарадкаваных ёй часцей, і адыграла важную ролю ў працяглым і складаным 4-дзённым наступленні на ўмацаваны горад Магілёў. Горад абараняўся праціўнікам упарта, вельмі моцна, адчайна, з выкарыстаннем мясцовасці і без аніякай думкі аб здачы.

З паказанняў палонных высветлілася, што абарона Магілёўскага плацдарма вялася 110-й і 172-й стралковымі дывізіямі з выкарыстаннем лёгкай і цяжкай артылерыі, а таксама рэшткамі шматлікіх баявых часцей, з якіх былі створаны новыя батальёны. Агульныя сілы праціўніка складалі амаль 3 дывізіі.

Колькасць узятых у палон 23-й дывізіяй перад (выдзелена ў тэксце. – С.Н.) канчатковым заняццем горада складала 10 афіцэраў і 3043 салдаты, шматлікае ваеннае ўзбраенне, многія гарматы і даволі значную колькасць часткова ацалелых самалётаў.

Уласныя страты ў перыяд з 20 па 26 ліпеня 1941 г. склалі:

а) афіцэры: загінула – 18; паранена – 36; зніклі без вестак – няма;

б) унтэр-афіцэры і радавыя: загінула – 246; паранена – 1052; зніклі без вестак – 83;

в) агульныя страты: загінула – 264; паранена – 1088; знікла без вестак – 83.

Подпіс *(Гельміх)*

*ЛІТАРАТУРА*

1. ***Волчок, Г.И.*** Оборона Могилева летом 1941 года: вопросы историографии / Г.И. Волчок // Оборонительные бои на территории Беларуси: мат-лы респ. науч.-практ. конф., посвящ. 65-летию обороны г. Могилева от немецко-фашистских захватчиков (29–30 июня 2006 года) / под ред. Н.М. Пурышевой. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2006. – С. 8-16.
2. ***Костеров, А.П.*** Оборона Могилева летом 1941 г.: историография, проблемы / А.П. Костеров // Великая Победа: героизм и подвиг народов: материалы международной научной конференции (Минск, 28 – 29 апреля 2005 г.): в 2 т. Т.1. / Отв. ред. А.М. Литвин. – Мн.: Институт истории НАН Беларуси, 2004. – С. 111-114.
3. ***Борисенко, Н.С.*** Днепровский рубеж: трагическое лето 1941-го / Н.С. Борисенко. – Могилев: УПКП "Могилевская областная укрупненная типография имени Спиридона Соболя", 2005. – 368 с.
4. ***Борисенко, Н.С.*** Проблема поиска имен и установления судеб защитников Могилева в июле 1941 года / Н.С. Борисенко // Оборонительные бои на территории Беларуси.... – С. 16-22.
5. ***Борисенко, Н.С.*** 20-й механизированный корпус: история создания и трагическая боевая судьба на Могилевщине / Н.С. Борисенко // Мінулая і сучасная гісто-

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

рыя Магілёва : зборнік навуковых прац / Уклад. І.А. Пушкін. – Магілёў: УПКП "Магілёўская абласная ўзбуйненая друкарня", 2001. – С. 267-277.
6. ***Борисенко, Н.С.*** 20-й механизированный корпус и его роль в обороне Могилева летом 1941-го года / Н.С. Борисенко // Могилевский поисковый вестник. – Могилев: УПКП "Могилевская областная укрупненная типография им. Спиридона Соболя", 2005. – С. 37-62.
7. ***Волчок, Г.И.*** Оборона Могилева летом 1941 года / Г.И. Волчок. Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2003. – 40 с.
8. ***Костеров, А.П.*** Бессмертный подвиг защитников Могилева летом 1941 года / А.П. Костеров. – Могилев: УПКП "Могилевская областная укрупненная типография имени Спиридона Соболя", 2004. – 208 с.
9. ***Костеров, А.П.*** Роль и значение оборонительных сражений на Могилевском направлении летом 1941 г. / А.П. Костеров // Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва... – С. 258-262.
10. ***Костеров, А.П.*** Оборона Могилева в контексте боевых действий Западного фронта в июле 1941 г. / А.П. Костеров // Беларусь в годы Великой Отечественной войны: уроки истории и современность : материалы Международной научной конференции, посвященной 60-й годовщине освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков, Минск, 29–30 июня 2004 г. – Мн.: Институт истории НАН Беларуси, 2004. – С. 74-75.
11. ***Еременко, А.И.*** Героический Могилев / А.И. Еременко // В начале войны. – М.: Изд-во "Наука", 1964. – С. 108-188.
12. BA-MA. RH 26–23/95: Abt. I a : Gefechtsbericht über die Schlacht um Mogilew v. 29.7.1941, Bl. 1–10.
13. Гриф секретности снят: Потери Вооруженных Сил СССР в войнах, боевых действиях и военных конфликтах: Статистическое исследование / В.М. Андроников [и др.]; под общ. ред. Г.Ф. Кривошеева. – М.: Воениздат, 1993. – 415 с.
14. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Магілёва / Беларус. Энцыкл.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 1998. – 496 с.
15. Памяць: Магілёўскі р-н: Гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / Укл.: У.Ф. Агурцоў, М.П. Хобатаў. – Мінск: Полымя, 1996. – 660 с.
16. Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва : зборнік навуковых прац / Уклад. І.А. Пушкін. – Магілёў: УПКП "Магілёўская абласная ўзбуйненая друкарня", 2001. – 368 с.
17. ***Шумский, В.В.*** Плен как историческое и социальное явление / В.В. Шумский // "Война и плен. Мартиролог" / авт.-сост. Ю. Поляков. – Мн.: Юнипак, 2005. – С. 42-43.
18. ***Павлов, Я.С.*** Система фашистских концлагерей для советских военнопленных в Беларуси / Я.С. Павлов // Трагедия плена. Фронт и плен: Сборник материалов научной конференции, 4–8 июня 1995 г. – Минск, 1995. – 115 с.
19. BA-MA. RH 24–7/48: KTB des VII. A.K.: Gen.Kdo.VII A.K./Abt. Ic : Die Erstürmung des befestigten Brückenkopfes Mogilew, v. 6.8.1941, Bl. 96–98 R.
20. BA-MA. RH 26–23/22: Kdo 23. Inf.-Div., Ia : KTB Nr. 6 für die Zeit vom 23.5.–7.8.1941, Bl. 31-52.
21. BA-MA. RH 24–7/40 : KTB des VII. A.K.: Gen. Kdo. VII A.K., Bl. 53-78.
22. BA-MA. RH 26–7/15: Kurzbericht über den Einsatz der Division in der „Schlacht von Migilew", v. 12.8.1941, Bl. 397-399.
23. BA-MA. RH 24–7/43: Die Erstürmung des befestigten Brückenkopfes Mohilew, v. 15.8.1941, Bl. 203-214.
24. BA-MA. RH 24–7/48: Abt. I c, Die Erstürmung des befestigten Brückenkopfes Mogilew, v. 6.8.1941, Bl. 95-96 R.
25. BA-MA. RH 26–23/25: Die Erstürmung des befestigten Brückenkopfes Mohilew, Bl. 282-293.
26. Могилевский поисковый вестник. – Могилев: УПКП "Могилевская областная укрупненная типография им. Спиридона Соболя", 2005. – Выпуск 2. – 160 с.

Паступіў у рэдакцыю 26.05.2008 г.

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова